4.Сакралізацыя культурных сэнсаў каляндарнай паэзіі ў паэмах “Яна і Я” Я.Купалы і “Цунамі” А.Куляшова.

Літаратура

1.Веснавыя песні. – Мінск: “Навука і тэхніка”, 1979.
2.Соколова В.К. Весенне-летние обряды русских, украинцев и белорусов. – М.: Наука, 1979.

**Семінар 7**

СЕМАНТЫКА ВОБРАЗНАЙ СІСТЭМЫ
Ў ЭТНІЧНЫМ РАМАНТЫЗМЕ XIX СТ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1.Канцэпт “прайсці праз вернасць” у цыкле свіцязянскіх баладаў А.Міцкевіча.
2.Нацыянальна-вызваленчы рух, валенрадызм і сімволіка літвінізму ў містэрыях А.Міцкевіча “Конрад Валенрод” і “Дзяды”.
3.Семантыка *разрыў-травы* на фоне антычнай канцэпцыі лёсу ў фальклорна-філасофскім рамане “Шляхціц Завальня” Я.Баршчэўскага.
4.*Цмок – Найяснейшая карона – свой чалаввек* – этапы сацыялізацыі міфалагічнай сімволікі.

Літаратура

1.Сержпутоўскі А.К. Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў. – Мінск: “Універсітэцкае”, 1999.
2.Бараг Л. Беларуская казка. – Мінск: “Навука і тэхніка”, 1969.

## Семінар 8
## АБРАДАВАЯ СІМВОЛІКА І СІТУАЦЫЯ КАТАСТРАФІЗМУ Ў КУЛЬТУРЫ ХХ СТ.

1.Лімінальны стан быцця і абрадавая сімволіка ў містэрыі Я.Купалы “Сон на кургане”.
2.Сацыяльна-псіхалагічнае аблічча русалак навейшага часу.
3.Відмы і касцятрупы замагільнага свету ў сацыяльнай рэчаіснасці Расійскай імперыі.
4.Сімволіка інфернальнага суіснавання ўлады і народа ў форме жыцця-смерці.
5.Светавід, задумны Сам і Сам-сітуацыя ў жанравых формах беларускай містэрыі.

Літаратура

1.Соколова В.К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. – М.: Наука, 1979.
2.Рагуля А. Тэатр сацыяльнага дзеяння // Янка Купала і Якуб Колас: Некаторыя аспекты творчасці / Пад агульн. рэд. А.А.Семяновіча. – Мінск: “Вышэйшая школа”, 1982.

## Семінар 9
## ЭВАЛЮЦЫЯ КУЛЬТУРНЫХ СЭНСАЎ АБРАДУ Ў ХХ СТ.

1.Трансфармацыя магіі ў формы эстэтычнага дзеяння ў паэзіі земляробчага каляндара ў ХХ ст. (“Жняя”, Я.Купалы, “Рольнік” і “Родныя вобразы” Я.Коласа і інш.).
2.Казка жыцця і класічны фальклорны канцэптуалізм у сучасным постфальклоры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3.Традыцыі фальклорнай фенаменалогіі ў эстэтыцы Старога дзеда Савіцкага, М.Багдановіча, Я.Коласа.

Літаратура

1.Багдановіч М. Музыка / Збор твораў у трох тамах. Т. 2. Мінск: Навука і тэхніка, 1993.
2.Колас Я. "Казкі жыцця", "Сымон-музыка".

## Семінар 10
ЗАЛАТЫ ПРАМЕНЬ:
ІНТЭГРАЦЫЯ САЛЯРНАЙ СЕМАНТЫКІ АБРАДУ І МЕЛАСУ

1.Дажджбог і яго мадыфікацыі ў абрадзе: Ярыла, Хорс, Дзед.
2.Духоўны шлях *задумных*: выйсце, ростані, сустрэча з Сонцам і Мілавіцай.
3.Вяртанне ў аватары залатога промня – сейбіта святла на духоўнай ніве.

Крыніцы

1.Колас Я. "Казкі жыцця", "Новая зямля", "Сымон-музыка", "На ростанях".

## Семінар 11
ГЕРОІКА-ФІЛАСОФСКІ КОМПЛЕКС (АРХЕТЫП)
У БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

1.Антрапалагічны змест вобразу ўсеагульнай Маці-Прыроды ў міфалогіі.
2.Матыў "Маці і яе дзеці ў фальклоры".
3.Мадонна – маці чалавечая ў беларускай культуры.
4.Фрэймы "*разумная дачка*" і "*маладыя гады, маладыя жаданні*" ў беларускай культуры ХХ стагоддзя.
5.Персаналіі "па кудзелі Рагвалодавічы" ў беларускай гісторыі (Усяслаў Полацкі, Глеб Мінскі, Еўфрасіння). Выявы з вёскі Велендорф, з вёскі Чарнавода; жанравая форма іканапісу "Маці Божая замілаванне"; "Партрэт маці" А.Дзюрэра; "Старая на маленні" А.Гараўскага; цыклы "Мадонны" ў творчасці М.Багдановіча, М.Савіцкага, "Мемарыяльны скульптурны комплекс у Жодзіне" (аўтары А.Трафімчук, А.Заспіцкі, М.Рыжанкоў, І.Міско), "Маці герояў" І.Міско.

Літаратура

1. Матерь Лада. Божественное богословие славян. Языческий пантеон. – М.: Изд-во Эксмо, 2003. – 452 с.
2. Пугачёва Э. Михаил Савицкий. – Мінск: Беларусь, 1982.
3. Багдановіч М. "Там вянкі суворай славы", "У вёсцы", "Мадонна" / Зб. тв. у 3 тамах. Т.1, 2. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993.
4. Куляшоў А. Маці / Зб. тв. у 5 т. Т. 1. – Мінск: Маст. літ., 1974.
5. Танк М. Рукі маці / Зб. тв. у 6 т. Т. 2. Мінск: Маст. літ., 1974.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Міско І.Я. Мемарыяльны помнік маці / Скульптура, – Мінск: “Доўгажыхар”, 1995

**Семінар 12**

ГЕРАІЧНЫ КОМПЛЕКС У ЭТНІЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ Ў ЭПОХУ ДЗЯРЖАЎ-КНЯСТВАЎ І ДЗЯРЖАЎ-ЗЯМЕЛЬ

1.Гераічная плынь у земляробчым эпасе (“Вальга і Мікула”).

2.Беларускае рыцарства ў барацьбе за незалежнасць у XI – XII стст.

3.Міфалагізаваныя персанажы – змагары супраць тыраніі – у народных паданнях і эпасе “Слова пра паход Ігаравы”.

4.Героі на ніве духу і філасофскага мыслядзеяння: Клімент Смаляціч, Кірыл Тураўскі, Еўфрасіння Полацкая, Лазар Богша, аўтар “Слова пра паход Ігаравы”.

Літаратура

1. Арлоў У. Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі. Мінск: БелЭН, 1995.

2. Слова пра паход Ігаравы. Мінск: 1952.

3. Асветнікі зямлі беларускай. Мінск: БелЭН, 2001.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 ЗАДАННІ ДЛЯ КАНТРАЛЮЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

**Выкананне самастойнай работы па дысцыпліне прадугледжана тэматычнымі планамі факультэта ТБКіСМ і абавязкова для кожнага студэнта.**

Студэнтам малодшых курсаў тэматыку рэкамендуе выкладчык.

Студэнтам старэйшых курсаў прапануецца пэўны кампендыум для самастойнага выбару матэрыялу для рэфлексіі, фармуліроўкі тэмы і структуравання даследавання.

Мэтай самастойнай навукова-даследчай працы з’яўляецца фарміраванне вербальнага выказвання – каштоўнаснай ацэнкі тых ці іншых з’яў культурнага працэсу. Выказванне прапануецца ў форме семіятычнага дыскурсу.

***Формы і патрабаванні да выканання самастойнай работы:***

1.Самастойнасць і арыгінальнасць інтэрпрэтацыі.

2.Арыентацыя на прынцып інтэнцыйнага канструявання.

3.Актыўнае выкарыстанне магчымасцяў матыўнага аналізу і генетыка-параўнальнага метаду.

4.Разгляд і ацэнка феномена ў гісторыка-культурным кантэксце.

5.Прэзентацыя даследавання ў вуснай і пісьмовай формах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГРАФІК КАНТРОЛЮ
# САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ
## па дысцыпліне **ЭТНАСЕМІЁТЫКА**

**ФТБКСМ, 403гр.**

| **Студэнты** | **даты кантролю I і II семестрах** | |
|---|---|---|
| | | |
| Белы Алег Уладзіміравіч | | |
| Верас Валянцін  Ігаравіч | | |
| Грынкевіч Валерыя Аляксееўна | | |
| Войцік Кацярына Сяргееўна | | |
| Мельнікава Крысціна Іванаўна | | |
| Сцельмашук Эльвіра Віктараўна | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

по дысцыпліне **ЭТНАСЕМІЁТЫКА**

1.Канцэпт “Хараство” на фоне эстэцкай трактоўкі вопыту рамантыкаў.

1.1.”Дзеўчына” Старога дзеда Савіцкага; “Музыка” М.Багдановіча.

1.2.Казка “Як па ягады сястрычкі хадзілі”.

1.3.Балады з цыклу “Маці і дачка”.

1.4.“Праметэй” М.Танка (зборнік “Збор калосся”).

2.Псіха-аналітычны комплекс “Пераадоленне”.

2.1.Межавы час і лімінальны стан у пахавальным і вясельным абрадах.

2.2.Топас “яечка не простае, а залатое” (“жылі-былі”).

2.3.Гульня “Гарол” (“Маці і яе дзеці”).

2.4.Перапяканне і пераплаўка ў культуры: фазы “агні і буры” і “абвостраная цвёрдасць” (“Вогненная” семантыка абрадаў і псіха-аналітычная і публіцыстычная плынь у вербальнай культуры).

3.Семіётыка рэнесанснага антрапацэнтрызму і сімволіка нізавога барока.

3.1.Іоў-сітуацыя ў інтэрпрэтацыі Ф.Скарыны.

3.2.Народная скульптура XVI стагоддзя: “Марыя з дзіцем”, “Гжэгаж” (“Рыгор”), “Укрыжаванне”.

3.3.Сімволіка нізавога барока: мужыцкі “Хрыстос перад Пілатам” (XVIII ст.) і мужыцкія апосталы.

3.4.Канцэпт “Мужыцкая праўда” (Матэрыялы з кнігі А.К.Лявонавай “Старажытнабеларуская скульптура”. Мінск: 1991)

4.Міфалагізацыя ў мастацкай культуры XX стагоддзя.

4.1.Цені, прывіды і здані ў народнай культуры.

4.2.Відмы і Сам-сітуацыя ў містэрыі Я.Купалы “Сон на кургане”.

4.3.Эвалюцыйны рад “Маці Божая і Чалавечая” ў беларускай культуры.

4.4.Комплексы *Праскева Пятніца* і *Страцім-лебедзь*: нацыянальная канцэпцыя гераізму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.3 ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ па вучэбнай дысцыпліне ЭТНАСЕМІЁТЫКА

1.Праект чалавечай сітуацыі ў абрадавым комплексе.

2.Канон і рытуал у сітуацыі постмадэрнасці.

3.Эмблематыка персанажаў у вясельным абрадзе.

4.Межавы час у калядным цыкле.

5.Лімінарны стан у купальскім абрадным дзеянні.

6.Хранатоп *пераадоленне* ў пахавальным абрадзе.

7.Гарызантальная і вертыкальная дынаміка (“страла”) культурных сэнсаў у абрадавым дзействе.

8.Сферычная структура кагнітыўнага дзеяння ў народнай культуры.

9.Парадыгмальная функцыя абраду.

10.Абрад: карнавалізаванае і містэрыяльнае мысленне.

11.Музыка і металексемныя сэнсы абрадавага дзеяння.

12.Вербальнае выказванне ў абрадавым дзействе.

13.Фальклорная і афіцыйная абраднасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.4 ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ па вучэбнай дысцыпліне ЭТНАСЕМІЁТЫКА

1. Аксіяматычная і семіятычная логіка ў комплексе кагнітыўнага дзеяння.
2. Канцэпты (мастацкі і ідэацыйны) і вербальнае выказванне.
3. Семантыка катэгорыяў “чалавечая сітуацыя” і “культурны сэнс”.
4. Хранатоп і стыль у народнай культуры.
5. Сферычная структура культурнага сэнсу.
6. Гістарычная тыпалогія культурнага працэсу.
7. Каштоўнасныя арыентацыі каляровай сімволікі ў культуры кроўнасваяцкага тыпу.
8. Семантыка вобраза ўсеагульнай Маці-Прыроды: беларускі варыянт у еўрапейскім кантэксце.
9. Універсальная этыка і панэстэтызм у культуры каляндарна-земляробчага тыпу.
10. Карнавалізаванае мысленне і смехавы канон: топас “амбівалентны ніз”.
11. Містэрыяльнае мысленне і трагедыйны канон: топас “пераадоленне”.
12. Структурная марфалогія народнай культуры.
13. Гамінізуючая функцыя народнай культуры і праблема супольнага суб’екта ў сітуацыі постмадэрна.
14. Прынцып інтэнцыйнага канструявання ў навуковым даследаванні народнай культуры.
15. Народная культура ў алігарха-дэмакратычным соцыумена прыкладах Антычнасці.
16. Народная культура ў саслоўна-каставай дзяржаве.
17. Народная культура і афіцыйная ідэалогія масавай культуры.
18. Семантыка круга і карагода ў народнай культуры.
19. Тыпавы напеў і вербальны тэкст у народнай песні.
20. Псіхагенез у працэсе станаўлення суб’екта культуры.
21. Структурная марфалогія семіёзісу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

22. Генератыўная семантыка мастацкага вобраза.
23. Семантыка дрэва пазнання ў народнай культуры.
24. Культурныя сэнсы сінекдахі “рукі” ў народнай культуры.
25. Эвалюцыя семантыкі імператыву “выжыць” у народнай культуры.
26. Сінтагма “мой хлеб надзённы” ў беларускай культуры.
27. Культурныя сэнсы сацыягенезу лексікодаў *радзіна,айчына, грамада, зямля, край.*
28. Семантыка гука-інтанацыйнай (музычнай) сімволікі.
29. Сімвалатворчая функцыя моўных зносін.
30. Феномен суб’екта ў народнай культуры.
31. Лабірынт і пушча ў фальклорнай культуры.
32. Сам-сітуацыя ў чарадзейнай казцы.
33. Топас “працягненасць” у фальклорнай лірыцы.
34. Экзістэнцыяльныя сэнсы каляровай сімволікі ў народнай культуры.
35. Інтэлектуальны патэнцыял вобразаў мацярынства ў культуры кроўна-сваяцкага тыпу.
36. Канцэпт хараства: інтэграцыя ідэалаў дабра і красы.
37. Семантыка вобразаў Неферціці, Джаконды і Мілавіцы.
38. Катэгорыі “парадыгма” і “стыль” культуры.
39. Мастацкі вобраз: узроўні абстрагавання і абагульнення.
40. Семантыка малога і вялікага ў народнай культуры.
41. Карціна самаканстытуявання беларускага этнасу ў люстры фальклорнай антрапалогіі.
42. Мастацкая і ідэацыйная функцыі канцэптаў *лад, дыхтоўнасць, хараство.*
43. Катэгорыі *дэнатат, канатат, культурная семантыка.*
44. Фальклорная рэфлексія ў комплексе сучаснай парадыгмы (*складка, пласт* і іншыя).
45. Моўная карціна свету на фоне крызісных з’яў у сучаснай кагніталогіі.
46. Артыкул Я. Коласа “Беларуская мова ў казённай школе”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.5 ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТАЎ, КУРСАВЫХ І ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ
па дысцыпліне **ЭТНАСЕМІЁТЫКА**

1.Каляндарны абрад у гісторыі эстэтычнай свядомасці беларускага этнасу.

2.Фальклорна-гераічнае светаўспрыманне ў беларускай культуры кроўна-сваяцкага тыпу.

3.Залатая горка і залаты прамень у беларускай мастацкай культуры.

4.Мастацкі канцэпт “шлях” у беларускай культуры.

5.Межавы час і межавая прастора ў беларускай культуры.

6.Казка жыцця як жанравая форма ў беларускай вуснай і пісьмовай прозе.

7.Культура інтымных адносін у беларускай абрадавай і пазаабрадавай паэзіі.

8.Канцэпты *пераадоленне* і *выйсце* ў жанры фальклорнай і літаратурнай містэрыі.

9.Культурная семантыка вербальнага і музычнага тэстаў у вобразнай структуры абраду.

10.Феномен фалькларызацыі ў беларускай храмавай скульптуры і жывапісе.

11.Беларускі народны тыпаж у этнаграфіі і нацыянальным мастацтве XIX – пачатку XX стст.

12.Псіхалагічны комплекс “Дзеўчына” ў беларускай народнай культуры.

13.Фрэйм “разумная дачка” ў беларускай культуры.

14.Жанр мікрарамана ў беларускай фальклорнай і літаратурнай прозе (на матэрыяле казкі “Удовін сын” і раманаў К.Чорнага “Млечны шлях”, “Макаркавых Волька” і інш.).

15.Псіхічныя комплексы *Машэка* і *голы звер* у беларускай культуры.

16.Канцэпт *першапачынальнікі* (*яна і я*) у беларускім мастацтве.

17.Топас *маці і яе дзеці* ў беларускай мастацкай культуры.

18.Сакралізацыя земляробчай і духоўнай працы ў беларускай культуры.

19.Гераічны комплекс беларускага менталітэту ў культуры кроўна-сваяцкага і каляндарна-земляробчага тыпаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

20.Праз прызму хараства: актуалізацыя фальклорнай эстэтыкі ў творчасці М.Багдановіча.

21.Лабірынт і пушча ў народнай культуры.

22.Фальклярызацыя рыцарскай субкультуры ў беларускім феадальна-саслоўным соцыуме.

23.Звычаёвае права ў Статутах 1529 і 1588 гадоў.

24.Лімінальны стан і *дачэсныя* ў беларускай культуры.

25.Топас *ваўчыная яма* ў бларускай культуры.

26.Традыцыйныя і актуальныя сэнсы сакральных дрэў і аб'ектаў прыроды ў беларускім мастацтве XX стагоддзя.

27.Актуалізацыя грамадзянскага патэнцыялу беларускай царкоўнай і рыцарскай субкультураў.

28.Літвінізм і сарматызм у беларускай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4.6 КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 3 (тры) | Аднаўленнестудэнтамчасткіпраграмнагаматэрыялу па памяці. Ізаляванасцьведаў па асобныхтэмах, персаналіях, крыніцах. |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца ВНУ ў дзейнасці сучасных устаноў сацыякультурнай сферы, шляхоў і сродкаў засваення фальклору). Веданне даследчай і навукова-метадычнай літаратуры. |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне праблемнага поля адукацыі ш ВНУ), веданне структуры аналізу навучання. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 6 (шесць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры і метадычнага фонду па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё праблемадукацыі ў ВНУ, фармуліроўка вывадаў. Уменнеаналізаваць вучэбны працэс. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі.<br>Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 9 (дзевяць) | Усведамленне студэнтам працэсаў сацыяльна-карыснага выкарыстання адукацыі і веданне інавацыйных шляхоў і сродкаў яе ўдасканалення, асэнсаванне досведу па эстэтычнаму аздабленню навучання. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць структуру вучэбнага працэсу, карыстацца навукова-метадычнай літаратурай па акрэсленых пытаннях.<br>Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне праблем арганізацыі вучэбнага працэсу ў ВНУ як навуковай галіны. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў адукацыі ў ВНУ на сучасным этапе. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з'явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па эстэтыцы і экалогіі культуры, праблемах і тэндэнцыях этнамастацкай адукацыі. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступный інструментарый:

- падрыхтоўка прэзентацый;
- падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);
- напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;
- напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;
- вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах.

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 ТЫПАВАЯ ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

1. Этнасеміётыка. Тыпавая вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (Фальклор) // склад. А.У. Рагуля. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 18 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 РАБОЧЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

Зацверджана
на пасяджэнні кафедры этналогіі і фальклору
ад 30.08.2016 г., пратакол № 1

ЭТНАСЕМІЁТЫКА

па курсе “Этнасеміётыка”

ФТБКіСМ групы 403

| Назва тэмы | | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | лекцыі | сем. зан. | |
| | I.Семіёзіс<br>Уводзіны. Этнасеміётыка ў структуры антрапалагічнага ведання. | 4 | 4 | | |
| 1. | Культурны сэнс і знакавыя формы семіёзісу. | 6 | 4 | | |
| 2. | Семіятычны дыскурс. | 6 | 4 | 2 | |
| 3. | Кароткая гісторыя станаўлення семіялогіі. | 4 | 4 | | |
| 4. | Гістарычная тыпалогія культурнага працэсу. | 4 | 4 | | |
| 5. | Тэорыя народнай культуры ў сучасным культуразнаўстве. | 4 | 4 | 2 | |
| 6. | Карціна быцця ў сімволіцы вербальнай мовы. | 6 | 4 | 2 | |
| | II.Праксіс<br>Кароткая гісторыя самаканстытуявання беларускага этнасу. | 4 | 2 | 2 | |
| 7. | Матрыярхат: ранні экзістэнцыялізм і культурнае табуіраванне. | 2 | 2 | | |
| 8. | Патрыярхат і рацыяналістычная плынь у культуры. | 4 | 2 | 2 | |
| 9. | Эстэтычная семантыка і сімволіка ў культуры каляндарна-земляробчага тыпу. | 2 | 2 | | |
| 10. | Семіёзіс у культуры эпохі дзяржаў-княстваў. | 2 | 2 | 2 | |
| 11. | Этнакансалідацыйныя працэсы ў эпоху дзяржаў-зямель. | 2 | 2 | | |
| 12. | Канцэптуальныя персанажы і гістарычныя персаналі ў беларускай культуры эпохі развітога феадалізму. | 2 | 2 | | |
| 13. | Антрапалагічная арыентацыя ў беларускай | 2 | 2 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | культуры эпохі Рэнесансу. | | | | |
| 14. | Сацыяльная структура беларускага этнасу ў эпоху цэнтралізаванай дзяржавы. | 2 | 2 | 2 | |
| 15. | Культурныя сэнсы і сімвалы беларускай прававой культуры эпохі цэнтралізаванай дзяржаўнасці. | 2 | 2 | | |
| 16. | Сімволіка беларускай этнакультурнай прасторы ў эпоху Новага часу. | 2 | 2 | | |
| 17. | Біфуркацыя ў нацыянальным культурным працэсе эпохі Асветы. | 2 | 2 | | |
| 18. | Вербалізацыя нацыянальнага культурнага працэсу ў эпоху каланіяльнай залежнасці. | 2 | 2 | | |
| 19. | Аксіялагічная сістэма беларускай народнай культуры навейшага часу. | 4 | 2 | 2 | |
| | III.Нацыянальная дактрына. Беларускія народныя кнігі. | 4 | 2 | 2 | |
| 20. | Універсітэт у гісторыі беларускага нацыянальнага асветніцтва. | 4 | 2 | | |
| 21. | КСРС | | | | 6 |
| 22. | Кансультацыя | | | | 2 |
| 23. | Экзамен | | | | 3 |
| 24. | Залік | | | | 2 |
| | Усяго | 93 | 62 | 18 | 13 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.3 МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Этнамастацкая адукацыя – прыярытэт дзейнасці кафедры, абраны пад уплывам агульных патрэб сацыякультурнага жыцця, паколькі намаганні дзяржавы захаваць народную культуру ў характрэрным для яе (вясковым) асяродку заўважны нават у *тэндэнцыях развіцця ўстаноў культуры* ў краіне. У Беларусі за прыпыненнем дзейнасці шэрагу клубаў з сярэдзіны 1990-х гг. да 2003 г. пачалі сваю дзейнасць 129 устаноў новага тыпу (табл.1). Менавіта для іх у свой час мадэлявалася падрыхтоўка спецыялістаў па напрамку «Фальклор» спецыяльнасці «Народная творчасць» ва БДУКМ.

Табліца 1 – Установы культуры Беларусі новага тыпу

| **Тыпы ўстаноў** | **Колькасць устаноў культуры новага тыпу ў вобласцях Беларусі на 2003 г.** | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Віцеб-ская вобл.** | **Гомельская вобл.** | **Гродзенс-кая вобл.** | **Магілёў-ская вобл.** | **Мінская вобл.** | **Брэсцкая вобл.** |
| дамы фа-льклору | 2 | 17 (5-вясковыя) | 10 | 1 | 17 (12-вясковыя) | 17 (16-вясковыя) |
| | **Разам 64 ўстановы** | | | | | |
| дамы рамёстваў | 21(20 – у рай-цэнтрах) | 13 (4-вясковыя) | 6 (2-вясковыя) | 6 (1-вясковы) | 14 (10-вясковыя) | 5 (4-вясковыя) |
| | **Разам 65 устаноў** | | | | | |

Колькасць такіх устаноў расце, а дзейнасць вядзецца вакол традыцыйнай матэрыяльнай культуры і фальклору. Сёння ў краіне ўтвораны скіраваны на этнамастацтва асветніцка-выхаваўчы комплекс, які мае праблемы з методыкамі працы і кадрамі. Існуючую структуру трэба «напаўняць зместам» праз выпрацоўку адэкватных форм працы і забеспячэнне спецыялістамі. Як сведчыць вопыт у галіне практычнай фалькларыстыкі мяжы стагоддзяў (у першую чаргу – вопыт Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», праца па правядзенні якога ўвесь час мацуецца падрыхтоўкай і працаўладкаваннем спецыялістаў з этнамастацкай адукацыей у розных рэгіёнах Беларусі), гэтыя праблемы здольна вырашыць этнамастацкая адукацыя. Як прыклад удалага менеджмента сацыяльна арыентаванай этнамастацкай адукацыі варта ўзгадаць сітуацыю, калі ў сярэдзіне 2000-х БДУКМ адрэагаваў на змену прыярытэтаў, адкрыўшы факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, кафедру этналогіі і фальклору, новыя спецыялізацыі па падрыхтоўцы фалькларыстаў-практыкаў.

Адпаведна нарматывам па ахове *нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС)*, сучасныя фалькларысты павінны праводзіць дзейнасць па 3 напрамках: **ахоўную** (праца з носьбітамі НКС Беларусі ў мэтах іх падтрымкі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стымуляцыі працэсу перадачы НКС паміж пакаленнямі); **этнакультурна-выхаваўчую** (праца з дзецьмі і моладдзю ў мэтах інтэгравання НКС у іх асяроддзе); **статыстычна-рэпрэзентатыўную** (маніторынг НКС, і інфармаванне пра яго вынікі). Напрацягу 2003 – 2009 гг. калектыў кафедры этналогіі і фальклору сумесна з супрацоўнікамі аддзела традыцыйнага мастацтва БелІПК выпрацаваў адладжаную мадэль дзейнасці па перайманні НКС, укараніў яе ў навучальны працэс этнамастацкай адукацыі, у выніку чаго праводзілася дзейнасць па ўсіх трох напрамках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4 МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ДЫСЦЫПЛІНЫ

У XXI ст. дзеячы культуры і педагогі Усходняй Еўропы паслядоўна шукаюць шляхі будовы мадэлі адукацыйнага працэсу на падмурку спадчыны мясцовых этнічных культур. Гэта заканамерна: даўней далучэнне да этнічнай культуры ладзілася ва ўмовах сям'і і суседскіх суполак, а зараз «этнізаваць» светасузіральна-паводзінныя стандарты дзяцей і моладзі спрабуюць з дапамогай этнакультурнага выхавання і этнамастацкай адукацыі. У межах этнакультурнага выхавання адбываецца *духоўнае ўдасканаленне асобы шляхам развіцця творчых здольнасцей дзіцяці сродкамі этнічнага мастацтва – фальклору яго этнасу*. Этнамастацкая адукацыя – працэс, які *забяспечвае этнакультурнае выхаванне педагагічнымі і кіруючымі кадрамі*.

У Расіі, краінах Балтыі і Скандынавіі этнакультурнае выхаванне і этнамастацкая адукацыя – дзяржаўная справа. Этнакультурныя цэнтры творчага развіцця працуюць па комплексных праграмах (з 7-гадовым навучаннем) з 1997 года. Яны прайшлі экспертную ацэнку і іх паспелі зацвердзіць Інстытут этнаграфіі народаў свету Расійскай акадэміі навук, Пецярбургскі педагагічны ўніверсітэт, Інстытут тэатра, музыкі і кінематаграфіі. Выдаецца серыя «Выхаванне і дадатковая адукацыя дзяцей», каардынатарам якой з'яўляецца Ўпраўленне выхавання і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Мінадукацыі Расіі (кіраўнік накірунку І.В. Каліш). Аналагічную працу ў Латвіі ладзяць E. Mingaila Tautas makslas centras, Latvijas Kultūras akadēmijas. У Літве гэтым паспяхова займаюцца Lithuanian folk culture center, Lithuanian ethnic culture society.

Для адсочвання эфектыўнасці адукацыі сёння актыўна выкарыстоўваюць менеджмент яе якасці, які звязаны з аналізам адукацыі як тавара (паслугі) для яе спажыўцоў (студэнта і яго працадаўцы на рынку працы). Не апошнім паказчыкам якасці адукацыі з'яўляецца яе камерцыйны патэнцыял: рэнтабельнасць і прывабнасць для інвестраў. У этнамастацкай адукацыі асноўны інвестар – дзяржава, у меншай ступені – прыватныя асобы і прадпрымальнікі. Гэта – натуральна, паколькі «адукацыя – набыццё грамадскакарысных ведаў, уменняў і навыкаў», а прыярытэтныя перспектывы грамадскага жыцця і кадравае забеспячэнне сацыякультурных практык як умову іх дасягнення вызначаюць перадусім органы дзяржаўнага кіравання, а не прыватныя асобы. Мэта артыкула – прасачыць *інавацыйныя змены ў этнамастацай адукацыі Беларусі пачатку XXI*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*стагоддзя*, абумоўленыя карэктыроўкай навучальнага працэсу для выканання запатрабаванняў яго інвестараў – дзяржавы і грамадства.

Ідэя пра тое, што фальклор – культурная спадчына Беларусі і дзейсны сродак патрыятычнага і этнакультурнага выхавання сёння актыўна выкарыстоўваецца дзяржавай. Напрыклад, з 2007 г., разам з пашпартам 16-гадовым беларусам уручаюць выданне з мультымедыйным дадаткам, дзе сярод фота шэдэўраў культуры Беларусі – фатаздымак дудароў (выканаўцаў на беларускай валынке) капэлы «Гуды» (мал. 1).




**Малюнак 1 – Вокладка выдання «Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь», якое ўрачыста ўручаюць беларускай моладзі і фатаздымак капэлы «Гуды» з гэтага выдання**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучасным вузкаспецыялізаваным грамадстве кожным відам дзейнасці займаюцца мэтанакіравана падрыхтаваныя асобы. Працаваць з аўтэнтычным фальклорам ва ЎВА пачалі нядаўна. Адзін з першых досведаў у Беларусі – кафедра этналогіі і фальклору БДУКМ (2003). Яе дзейнасць мае канцэптуальны напрамак і выпрацоўвае адукацыйныя мадэлі для вышэйшай школы, якія б спрыялі захаванню і ахове каранёвай культуры краіны. Асноўныя інавацыйныя дасягненні прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры на працягу 2003 – 2013 гг. : а) распрацоўка і паспяховае ўкараненне ў вучэбны працэс мадэлі вузаўскай падрыхтоўкі спецыяліста-практыка па захаванні фальклору; б) распрацоўка і ўкараненне адукацыйнай мадэлі кафедры практычнай фалькларыстыкі (мастацтва вуснай традыцыі).

Мадэль УВА-падрыхтоўкі спецыяліста-практыка па захаванні фальклору (мал. 1) акамулюе вопыт выкладання Санкт-Пецярбургскай акадэміі музыкі (кансерваторыі) імя М.А. Рымскага-Корсакава, Вільнюскай акадэміі музыкі, дзе аддзяленні этнамузыкалогіі (на якіх рыхтуюць «фалькларыстаў, якія спяваюць ці граюць» – як альтэрнатыву «этнографам-аналітыкам» і «стылізатарам-фальсіфікатарам» фальклору) існуюць шмат год і зараз іх досвед з асяродкаў УВА інтэгруецца ў асяродак музычных каледжаў і сацыякультурную практыку.




**Малюнак 2 – Кафедральная мадэль падрыхтоўкі фальклырыста-практыка (2004)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.5 ЛІТАРАТУРА

### Асноўная

1. Арлоў, У. Жываторны сімвал Бацькаўшчыны / У. Арлоў. – Мінск: “Асар”, 1998. – 328 с.

2. Бахтин, М. Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренесанса. / М. Бахтин. – М.: Художественная литература, 1969. – 527 с.

3.М.Бахтин. – М.: Худож. лит., 1969. – 527 с.

4. Башляр, Г. Избранное: Поэтика пространства / Гастон Башляр. – М.: РОССПЭН, 2004. – 376

5. Башляр, Г. Земля и грёзы воли / Гастон Башляр, – М.: Издат. гуманитарной литературы, 2000. – 384 с.

Беларуская думка XX стагоддзя / Уклад. Ю.Гарбінскі. – Варшава, 1998

6. Бердяев, Н. Смысл истории / Николай Бердяев, – М.: “Мысль”, 1990. – 175с.

7. Голан, А. Миф и символ / Ариэль Голан. – М.: РУССЛИТ, 1994. – 375 с.

8. Валодзіна, Т. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т.В. Валодзіна. – Мінск: 1999. – 168 с.

9.Грынчык, М. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі / М.М. Грынчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 294 с.

10.Делёз Г., Гваттари Ф. Что такое философия / Ж. Делёз, Ф. Гваттари. – М.: Институт экспериментальной социологии; С.-Пб.: «Алетея», 1988. – 286 с.

11. Домострой / М.: Издатель Захаров, 2001. – 140 с.

12. Казакова, І.В. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І.В. Казакова. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 151 с.

13. Кацар, М.С. Беларускі арнамент / М.С. Кацар. – Мінск: БелЭН, 1996. – 2008 с.

14. Лосеў, А. Проблема символа и реалистического искусства / А.Ф. Лосев. – М.: “Искусство”, 1976. – 364 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. Лявонава, А.К. Старажытнабеларуская скульптура / А.К.Лявонава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 208 с.

16.Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В.В. Дубровский и др. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 319 с.

17. Семиотика: Антология / Сост. Ю.С.Степанов. – М.: Акад. Проект, Екатеринбург: Деловая книга, 2001. – 702 с.

18. Тёнис, Ф. Общность и общество / Ф.Тёнис. – С.-Пб.: Владимир Даль, 2002.

19. Фром, Э. Человеческая ситуация / Э. Фром. – М.: “Смысл”, 1995. – 239с.

## Дадатковая

1. Беларускія народныя абрады / Склад. Л.П.Касцюкавец. – Мінск: Беларусь, 1994. – 128 с.
2. Говард, М. Сучасная культурная антрапалогія / Майкл Говард. – Мінск: «Тэхналогія», 1995. – 480 с.
3. Лабачэўская, В. Повязь часоў – беларускі ручнік / Вольга Лабачэўская / Мінск: Беларусь, 2002. – 240 с.
4. Мальдзіс, А. Як жылі нашы продкі ў XVIII ст. / Адам Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 2009. – 480 с.
5. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М.Сахута. – Мінск: БелЭн, 1997. – 288 с.
6. Фрэзер, Дж.Дж. Золотая ветвь: Исследование магии и религии / Джеймс Джордж Фрэзер. М.: «Издательство АСТ», 1998. – 784 с.
7. Ясперс, К. Смысл и назначение истории / Карл Ясперс. – М.: «Республика», 1994. – 524 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.6 ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

1. Восточнославянский фольклор: словарь научной и народной терминологии / редакционная коллегия, Г.А. Барташевич, К.П. Кабашников (отв. редактор) – Мінск : Навука і тэхніка, 1993 г. – 478 ст.
2. Tillis, Steve. Rethinking Folk Drama / Steve Tillis. – Westport, Connecticut; London : Greenwood Press, 1999. – 226 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ